# "СВЕТ АД СВІТАНКУ ДА ПРЫЦЕМКАЎ"

**адукацыйна-дакументальны праект**


**аўтары праекту:**

Мацей Дрыгас

Мірослаў Дэмбіньскі

**суаўтары:**

Марцэль Лазіньскі

Яцэк Блавут

Віта Жэлякевічутэ

Матэўш Вэрнэр

Павэл Лазіньскі

Яцэк Петрыцкі

Рафал Лістопад



STUDIO FILMOWE EVEREST

**2011**

Штодня тэлебачанне перадае нам вобразы свету: войны, землятрусы, палітычныя дэманстрацыі, футбольныя матчы, біржавыя каціроўкі. Кожная важная падзея даходзіць да нас з любога месца ў рэжыме рэальнага часу. Але ці ўся гэта праўда пра наш свет, ці толькі яго павярхоўнае адлюстраванне? Ці можна зазірнуць глыбей, пад паверхню загалоўкаў навінаў? Няўжо ўсмешка гандляра на рыбным рынку ў Пекіне, альбо задуменны позірк жабрака ў маскоўскім метро не распавядуць нам больш пра сённяшні свет?

Такі дакументальны метад назірання рэчаіснасці мы запрапанавалі нашым студэнтам Лодзінскай кінашколы. Цягам некалькіх гадоў мы ажжыцяўлялі праект **"Лодзь ад світанку да прыцемкаў"**.

Мы запрасілі да супрацы нашых калегаў, выбітных польскіх дакументалістаў, стваральнікаў і тэарэтыкаў фільму: Марцэля Лазіньскага, Яцэка Блавута, Віту Жэлякевічутэ, Паўла Лазіньскага, Яцэка Петрыцкага, Рафала Лістапада і Матэўша Вэрнэра, каб разам ажыццявіць праект **«Свет ад світанку да прыцемкаў»** у пяці сталіцах свету. Студэнты кінашколаў Менску, Кіева, Масквы, Пекіну і Токіё зробяць дакументальныя здымкі сваіх гарадоў, якія будуць адрозніваца ад тых, што мы бачым штодня па тэлевізары.

Такім чынам паўстане цыкл фільмаў, які можа стацца адпраўной кропкай для больш глыбокіх разважанняў пра наш сучасны свет.

Міраслаў Дэмбіньскі, Мацей Дрыгас

# "СВЕТ АД СВІТАНКУ ДА ПРЫЦЕМКАЎ"

## Абгрунтаванне

**„Свет ад світанку да прыцемкаў”** – гэта праект, у рамках якога група выбітных польскіх дакументалістаў правядзе практычныя заняткі са студэнтамі кінашколаў пяці гарадоў свету: Менску, Кіеву, Масквы, Пекіну і Токіё. У рамках гэтых заняткаў паўстануць дакументальныя фільмы – партрэты гэтых гарадоў працягласцю ў гадзіну. Метад правядзення заняткаў і вытворчасці фільмаў абапіраецца на аўтарскай канцэпцыі Міраслава Дэмбіньскага і Мацея Дрыгаса “Лодзь ад світанку да прыцемкаў”, якую цягам некалькіх гадоў ажыццяўляюць студэнты Лодзінскай Кінашколы.

Праект высока ацаніў Інстытут Адама Міцкевіча (Instytut Adama Mickiewicza), і яго ўключылі ў праграму прамоцыі польскай культуры за мяжою ў сувязі з прыняццем Польшчаю старшынства ў Еўразвязе.

Праект атрымаў станоўчую ацэнку Польскага Інстытуту Кінамастацтва (PISF), паколькі ён ажыццяўляе мэты Інстытута, акрэсленыя як у прыярытэце “Адукацыя і распаўсюджванне кінакультуры”, так і ў прыярытэце “Кінапрадукцыя”.

Праект прыхільна прыняла Мінстэрства замежных справаў, а таксама ён атрымаў арганізацыйную і фінансавую дапамогу польскіх дыпламатычных прадстаўніцтваў у пералічаных гарадах.

Польскае грамадскае тэлебачанне (Telewizja Polska S.A.) заявіла пра сваю гатоўнасць далучыцца да праекту, а таксама прыняць удзел у вытворчасці фільмаў.

Фільмы, якія паўстануць падчас заняткаў, пакажуць таксама і падчас шэрагу мерапрыемстваў, прысвечаных прамоцыі польскай культуры, як у прадстаўніцтвах Інстытуту Адама Міцкевіча, так і на еўрапейскіх тэлеканалах.

# "СВЕТ АД СВІТАНКУ ДА  ПРЫЦЕМКАЎ"

**Масква, Кіеў, Менск, Токіё, Пекін** – гарады, у якіх няма амаль нічога агульнага: розныя культуры, розныя мовы, розная гісторыя. Кожны з іх ўжо не аднойчы апісвалі. Кожны з гэтых гарадоў атрымаў свае стэрэатыпы, капіраванне якіх стварае агульна вядомы вобраз гэтых гарадоў. Аднак пад гэтымі банальнымі вобразамі хаваецца іншая рэчаіснасць, разнастайнае жыццё. Мы хочам адчуць пульс гэтага жыцця, прабіць знешную шкарлупіну.  Дакрануцца да праўды пра чалавека праз ягоны найглыбейшы, асабісты досвед, ухапіць драматычныя і смешныя моманты – і ўсё гэта дзякуючы назіранню эпізодаў з жыцця.

**Менск, 6.00**
Супрацоўнік кансэрваторыі ў Менску, оперны саліст, тэнар Уладзімір З. выходзіць з дому з цяжкім заплечнікам. Ён адпраўляецца на лецішча, што знаходзіцца на ўскрайку гораду. На лецішчы стаіць стары, спісаны з войска вагон. Уладзімір выцягвае з заплечніка цагліны і муруе фрагмент каміна. Трэба скончыць да 10.00, бо ў яго заняткі спеваў.
**Менск, 10.00**
Коля Ф., магільшчык на гарадзкіх могілках няспешна капае яму. Каля яе – труна і сям'я нябожчыка. Замест папа працаўнік ЗАГСу. Усе цярпліва чакаюць – без ямы не будзе пахавання.
**Менск, 19.00**
Плошча Каліноўскага. Міліцыя правярае дакументы ў маладых людзей з валентынкамі, на якіх напісана: "Люблю Беларусь". Праверка дакументаў на ўсялякі выпадак распаўсюджваецца на ўсіх закаханых, якія шпацыруюць па плошчы.

**Кіеў, 5.30**
Ірына С., стрыптызёрка толькі што скончыла працу ў гатэлі "Украïна". Яна ідзе праз пусты Майдан, пастукваючы высокімі абцасамі. У падземным пераходзе яна купляе піражкі ў бабулі, закутанай у сцёганую ватоўку. Жанчыны не глядзяць адна другой у вочы. У метро яскравая Ірына зліваецца з шэрым натоўпам людзей, якія спяшаюцца на працу ў першую змену.
**Кіеў, 11.00**
Гістарычны музей. Зала гісторыі Галадамору трыццатых гадоў. Галіна С. мые мармуровую падлогу анучай, наматанай на швабру. Яна цярпліва палошчыць анучу ў пагнутым вядры, выкручвае яе. Жанчына не затрымала натоўп крыклівых вучняў, якія ў брудных ботах пабеглі ў залу Памаранчавай Рэвалюцыі.
**Кіеў, 22.00**
Дрэсіроўшчык шымпанзэ, Саша М., здымае грым пасля прадстаўлення ў цырку. Ён сумны і стомлены. Паліць цыгарэту. Некалькі разоў зацягваецца і перадае цыгарэту шымпанзэ Тані. Таня умелым рухам укладвае цыгарэту ў рот і выпускае дым носам. Таксама задумваецца…

**Масква, 7.00**

Натоўпы масквічоў на бясконцым эскалатары, які вядзе ў бездань метро. Стомленыя твары без эмоцыяў. Іхныя постаці знікаюць у цемры. Еўдакімія Г., удзельніца секты “Шлях да Бога”, поўным пакоры жэстам, раздае ўлёткі з запрашэннем далучыцца да секты. Некаторыя іх бяруць, некаторыя – не. Каляровыя ўлёткі з надпісам “Бог ёсць паўсюль” з’язджаюць у бяздонне метро.

**Масква 14.30**

Балетная школа. Перапынак падчас уроку рытмікі. Першакласніцы ў балетных касцюмах гуляюць у бэрыка. Толькі Аня К. сядзіць у шпагаце пад вялікім люстрам. Яна старанна выводзіць ліст маме, якая жыве на Сахаліне, піша, што сумуе...

**Масква 23.30**

Вяселле Алены Ц. і Андрэя С. П’яныя госці крычаць “Горка! Горка!”. Нявеста, хістаючыся, прыпадае вуснамі да свайго таксама пьянага мужа. Прыём адбываецца ў рэстарацыі “Буран”, якая месціцца ў былым касмічным чоўнаку, які ніколі не паляцеў у космас па прычыне спынення праграмы даследаванняў.

**Пекін, 6.00**

Лінг Янг Т. выходзіць з дому…

**Токіё 11.00**

Ямамота А. сядае ў аўтобус…

Цікава, як будуць выглядаць Пекін і Токіё ад світанку да прыцемкаў? Мы спадзяемся, што ўражлівасць і здольнасць да назірання нашых азіяцкіх студэнтаў створаць унікальны, вельмі асабісты вобраз гэтых далёкіх гарадоў.

Менск, Кіеў, Масква, Пекін, Токіё – на каждым з вобразаў гэтых гарадоў студэнты пакінуць свае сляды. Нашая задача – абудзіць іхную ўражлівасць і падказаць, як пабудаваць больш глыбокія сэнсавыя прасторы.

Кожны з гэтых фільмаў апісвае адзіны горад, а ўсе разам ствараюць вобраз, які, спадзяемся, схіліць гледача да развагаў пра сучасны свет.

# "СВЕТ АД СВІТАНКУ ДА ПРЫЦЕМКАЎ"

**"Свет ад світанку да прыцемкаў"** – гэта аўтарскі праект Міраслава Дэмбіньскага і Мацея Дрыгаса, які заключаецца ў рэалізацыіі цыклу майстар-класаў для студэнтаў кінашколаў у розных гарадах свету. Студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў цягам месяца разам працуюць над калекцыяў дакументальных эцюдаў, галоўны герой якіх – горад. У выніку паўстаюць дакументальныя фільмы кожны працягласцю каля гадзіны, якія паказваюць вобразы гэтых гарадоў.

**<u>Мастацкая канцэпцыя</u>**

Кожны студэнт абярае для сябе канкрэтны час, і намагаецца знайсці сітуацыю, якая мае месца дакладна ў гэты час. Асобныя эцюды складаюць эпізод, які мае сваю ўласную драматургічную канструкцыю. З такіх эпізодаў складаецца дакументальны фільм працягласцю ў гадзіну.

Кожны студэнт складае вобраз "сваёй гадзіны", група студэнтаў малюе вобраз горада "ад світанку да прыцемкаў", калекцыя з некалькіх фільмаў апісвае "свет ад світанку да прыцемкаў".

**<u>Фармальныя канцэпцыя</u>**

Эцюды трэба выканаць дапамогаю метаданазірання, без інсцэніровак і правакацыяў, далёкіх ад журналісцкай публіцыстыкі.

Эцюды павінны доўжыцца ад 4 да 5 хвілінаў. Такая форма забяспечвае ўласны драматургічны ход падзеяў, а таксама прымушае да лаканічнасці.

Эцюды і ўвесь фільм трэба будаваць паводле прынцыпу – ад дробязяў да метафары.

**<u>Адукацыйная канцэпцыя</u>**

Праект прадугледжвае супрацу кіраўнікоў са студэнтамі на ўсіх этапах яго ажыццяўлення ў форме практычных заняткаў

- фотадакументацыя ў розных раёнах гораду,
- выбар і публічная прэзентацыя праектаў (пічынг),
- стварэнне сцэнароў і аналіз здымачных матэрыялаў з пункту гледжання асобных эцюдаў і ўсяго фільму (мастацкая індывідуальная і калектыўная адказнасць),
- мантаж з акцэнтам на ўменне збудаваць больш глыбокія сэнсавыя прасторы (стварэнне арганічнай сувязі паміж вобразам і гукавай прастораю)

**<u>Міжнародная супраца</u>**

Ствараць фільмы будуць студэнты з мясцовых кінашколаў пад мастацкім кіраўніцтвам польскіх дакументалістаў: Мацея Дрыгаса, Міраслава Дэмбіньскага – выкладчыкаў Лодзінскай кінашколы, а таксама Яцэка Блавута, Марцэля

Лазіньскага і Віты Жэлякевічутэ са Школы Майстраў Анджэя Вайды. У праекце таксама прымуць удзел іншыя вядомыя польскія творцы: Павал Лазіньскі, Яцэк Петрыцкі, Рафал Лістопад і Матэўш Вэрнэр.

**Міжнародны эфект праекту**

- абмен адукацыйным досведам паміж кінашколамі
- параўнанне, назіранне за адрозненнямі і падабенствамі культур асобных гарадоў і грамадстваў
- абмен досведам паміж выкладчыкамі і студэнтамі асобных навучальных установаў (як досведам стварэння дакументальнага эцюду, так і ўражаннямі культурнага і сацыялагічнага характару)

**Канчатковы вынік праекту**

агульны прэм'ерны паказ калекцыі дакументальных эцюдаў "Свет ад світанку да прыцемкаў" – у Пекіне, Токіё, Маскве, Менску і Кіеве, а таксама ў іншых гарадах у рамках прамоцыі польскай культуры за мяжою ў сувязі з прыняццем Польшчаю старшынства ў Еўразвязе

- выданне калекцыі дакументальных эцюдаў "Свет ад світанку да прыцемкаў" на dvd
- паказы на фестывалях, а таксама ў тэлевізійным эфіры

Праект завершыцца прэзентацыяй створаных фільмаў і стужак мастацкіх кіраўнікоў у рамках цыклу паказаў пад назваю: **«З Варшавы ў Брусель вакол свету» (Варшава, Менск, Масква, Пекін, Токіё, Брусель).**

# "СВЕТ АД СВІТАНКУ ДА ПРЫЦЕМКАЎ"

**Абгрунтаванне вытворчасці**

Арганізацыя практычных заняткаў і здымкі фільму ў кожным горадзе адбываецца ў адпаведнасці са схемаю:

**Дакументацыя**

Дзве асобы: выкладчык і кіраўнік прадукцыі цягам 2-3 дзён падрыхтоўваюць тэарэтычную і вытворчую базу заняткаў.

**a. Тэарэтычная база:** вызначэнне партнёраў з мясцовай кінашколы, арганізацыя групы ўдзельнікаў, прадстаўленне ім канцэпцыі праекту

**b. Вытворчая база:** арганізацыя памяшканняў і мультымедыйнага абсталявання для заняткаў, рэзервацыя гатэляў і г. д.

**Практычныя заняткі**

Падзеленыя на тры этапы. На першым і трэцім – студэнты супрацоўнічаюць з трыма выкладчыкамі і тэхнічнай камандаю, якая складаецца з трох асобаў (аператар, мантажор і кіраўнік прадукцыі). На другім этапе студэнты здымаюць і мантажуюць фільм з дапамогаю выключна тэхнічнай каманды.

**a. Першы сцэнарна-дакументальны этап:**

3 дні агульных заняткаў – сцэнарна-дакументальных (выбар праектаў, дадатковая дакументацыя, зацверджанне сцэнароў)

**b. Другі здымачна-мантажны этап:**

5 дзён заняткаў (10-12 групаў, 4 камплекты здымачнай тэхнікі)

**c. Трэці мантажна-паствытворчы этап:**

7 дзён агульных заняткаў – аналіз матэрыялаў, дадатковыя здымкі, рэкамендацыі па мантажы, аналіз чарнавых варыянтаў змантаваных эцюдаў, папраўкі, фінальны мантаж, вызначэнне чарговасці сюжэтаў, агучка, канчатковая праекцыя, падсумаванне заняткаў

**Заключная праца**

Ужо ў Польшчы ўсе фільмы пройдуць канчатковую паствытворчую апрацоўку: мастэрынг, польскія і англійскія тытры, паўстануць копіі для эфіру і паказаў.

# "СВЕТ АД СВІТАНКУ ДА ПРЫЦЕМКАЎ"



**МІРОСЛАЎ ДЭМБІНЬСКІ**
Выкладчык Кінашколы ў Лодзі
- цягам 20 гадоў зняў 30 дакументальных фільмаў, сярод якіх:
**“ПАМАРАНЧАВАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА” (”POMARAŃCZOWA ALTERNATYWA”) 1989**
**“ІКАР” („IKAR”) 1999**
**“ПЕРАМОЖЦЫ І ПЕРАМОЖАНЫЯ” („ZWYCIEZCY I PRZEGRANI”) 2004**
**“УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ” („LEKCJA BIAŁORUSKIEGO”) 2006**
**“МУЗЫЧНЫЯ ПАРТЫЗАНЫ” („MUZYCZNA PARTYZANTKA”) 2007**
Атрымаў больш за 80 узнагародаў, сярод якіх:
**Спецыяльная ўзнагарода (Амстэрдам)**
**Спецыяльная ўзнагарода (Обэргаўзэн)**
**Спецыяльная ўзнагарода (Ляйпцыг)**
**Прыз Еўропа (Берлін)**
**Бронзавы Лайконік (Кракаў)**
**Залатая Брама (Сан-Франсіска)**
**Белая Кобра (Лодзь)**



**МАЦЕЙ ДРЫГАС**
Выкладчык Кінашколы ў Лодзі
Дакументаліст з 20-ці гадовым досведам
Зняў шэраг фільмаў, сярод якіх наайважнейшыя:
**“ПАЧУЙЦЕ МОЙ КРЫК” (“USŁYSZCIE MÓJ KRZYK”) 1991**
**“СТАН НЕВАЖКАСЦІ” (“STAN NIEWAŻKOŚCI”) 1994**
**“ГОЛАС НАДЗЕІ” (“GŁOS NADZIEI”) 2002**
**“АДЗІН ДЗЕНЬ У ПНР” (“JEDEN DZIEŃ W PRL”) 2005**
Атрымаў больш за 20 узнагародаў
**Еўрапейская кінаўзнагарода Felix**

**Срэбрны Цмок (Кракаў)**
**Гран Пры (Мельбурн)**
**Гран Пры (Монтэ Карло)**
**Спецыяльны прыз (Італія)**
**Залатая брама (Сан Франсіска)**
**Белая кобра (Лодзь)**



## МАРЦЭЛЬ ЛАЗІНЬСКІ

Выкладчык у Школе Майстраў Анджэя Вайды
- цягам амаль 40 гадоў здымае дакументальныя фільмы
- зняў каля 40 фільмаў, сярод якіх найважнейшыя:

**„POSTE RESTANTE” 2008**
**„КАБ НЕ БАЛЕЛА” („ŻEBY NIE BOLAŁO”) 1998**
**„УСЁ МОЖА ЗДАРЫЦЦА” („WSZYSTKO MOŻE SIĘ PRZYTRAFIĆ”) 1995**
**„89 ММ АД ЕЎРОПЫ” („89 MM OD EUROPY”) 1993**
**„МАЁ МЕСЦА” („MOJE MIEJSCE”) 1986**
**„ТЭСТ МІКРАФОНУ” („PRÓBA MIKROFONU”) 1980**
**„ІСПЫТ НА СТАЛАСЦЬ” („EGZAMIN DOJRZAŁOŚCI”) 1979**
**„ЯК ЖЫЦЬ” („JAK ZYC”) 1977**

- атрымаў каля 50 узнагародаў, сярод якіх:

**Намінацыя да прэміі “Оскар”**
**Еўрапейская кінаўзнагарода Felix**
**Гран пры (Обэргаўзэн)**
**Залаты голуб (Ляпцыг)**
**Залаты Цмок і Залаты Лайконік (Кракаў)**
**Залатая Брама (Сан-Франсіска)**
**Белая Кобра (Лодзь)**



## ЯЦЭК БЛАВУТ

Выкладчык у Школе Майстраў Анджэя Вайды
- цягам 30-ці гадоў здымае дакументальныя фільмы

- зняў каля 30-ці фільмаў, сярод якіх найважнейшыя:
**„ЯШЧЭ НЕ ВЕЧАР" („JESZCZE NIE WIECZÓR") 2008**
**„ВАЯР" („WOJOWNIK") 2007**
**„ПАЦУК У КАРОНЕ" ("SZCZUR W KORONIE") 2005**
**"НАРОДЖАНЫ МЁРТВЫМ" („BORN DEAD") 2004**
**"НЕНАРМАЛЬНЫЯ" („NIENORMALNI") 1990**
- атрымаў каля 60-ці ўзнагародаў, сярод якіх:
**Гран Пры (Таронта)**
**Срэбрныя Львы (Гдыня)**
**Залаты і бронзавы Лайконік (Кракаў)**
**Спецыяльная ўзнагарода (Мангайм)**
**Спецыяльная ўзнагарода (Сан-Сэбаст'ян)**
**Белая Кобра (Лодзь)**



## ВІТА ЖЭЛАКЕВІЧУТЭ

Выкладчыца ў Школе Майстраў Анджэя Вайды
- цягам больш 10 гадоў здымае фільмы,
сярод якіх найважнейшыя:
**"ШЫЗАФРЭНІЯ" („SCHIZOFRENIA") 2001**
**"ПА ІНШЫМ БАКУ" („PO TAMTEJ STRONIE") 2007**
**"КРЫНІЦА" („ŹRÓDŁO") 2009**
- атрымала некалькі ўзнагародаў:
**Gold Remy Award (Г'юстан)**
**Белая Кобра (Лодзь)**
**Грын пры (Кельцэ)**



## МАТЭЎШ ВЭРНЭР

Выкладчык Універсітэту кардынала Стэфана Вышыньскага,
Кінакрытык і тэарэтык кіно, аўтар некалькіх кніжак і публікацыяў.
Ініцыятар і арганізатар кінасемінараў "Польшча-Расея" і "Польшча-Ізраіль".



## ПАВЭЛ ЛАЗІНЬСКІ

Выкладчык Кінашколы ў Гдыні
- цягам 20 гадоў здымае дакументальныя фільмы
- зняў шэраг фільмаў, сярод якіх найважнейшыя:

**"ХІМІЯ" („CHEMIA") 2009**
**"ПАМІЖ ДЗЬВЯРЫМА" („MIĘDZY DRZWIAMI") 2004**
**"СЕСТРЫ" ("SIOSTRY") 1999**
**"ТАКАЯ ГІСТОРЫЯ" ("TAKA HISTORIA") 1999**
**"КРАТКА" ("KRATKA") 1996**
**"МЕСЦА НАРОДЗІНАЎ" ("MIEJSCE URODZENIA") 1992**

- атрымаў шматлікія ўзнагароды, сярод якіх:

**Prix Europa (Берлін)**
**Special prize (Ляйпцыг)**
**Залаты і Срэбрны Лайконікі, Залаты Цмок (Кракаў)**
**Белая Кобра (Лодзь)**
**Залаты Голуб (Ляпцыг)**



## ЯЦЭК ПЕТРЫЦКІ

- цягам 30-ці гадоў зняў больш за 100 дакументальных і мастацкіх фільмаў, сярод якіх:

**"ПРАВІНЦЫЙНЫЯ АКТОРЫ" („AKTORZY PROWINCJONALNI") рэж. Агнешка Голланд 1978**
**"ФОТААМАТАР" („FOTOAMATOR") рэж. Кшыштаф Кесьлёўскі 1980**
**"ДОСТУП" („PRZESŁUCHANIE") рэж, Рышард Бугайскі 1982**
**„UNFORGIVING" рэж. Клайв Гордан 1993**
**"ДАЛІНА" („THE VALLEY") рэж. Дэн Рыд 1998**
**"THE PIPELINE NEXT DOOR" рэж. Ніно Картадзэ 2005**

- атрымаў некалькі дзясяткаў узнагародаў, сярод якіх:

**FIPRESCI (Кан)**

**Залаты Х’юга (Чыкага)**
**Гран Пры (Масква)**
**Залатая Пальма для найлепшай акторкі (Кан)**
**Найлепшы Еўрапейскі Фільм (Берлін)**
**Намінацыя за здымкі да Еўрапейскай кінаўзнагароды ўзнагароды Felix**
**BAFTA за здымкі**
**Узнагарода “Prix Italia” 1999**



## РАФАЛ ЛІСТОПАД

Выкладчык Кінашколы ў Гдыні
- цягам некалькіх гадоў займаецца мантажам дакументальных і мастацкіх фільмаў.
Сярод ягоных працаў:
**“КАТЫНЬ” („KATYŃ") рэж. Анджэй Вайда 2007**
**“ЧОРНЫ ЧАЦВЕР” („CZARNY CZWARTEK”) рэж. Антоні Краўзэ 2011**
**“ЧУЖЫЯ ЛІСТЫ” („CUDZE LISTY”) рэж. Мацей Дрыгас 2011**
**“ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЯ” („INWENTARYZACJA”) рэж. Павэл Лозіньскі 2010**
**“ГОРАД БЕЗ БОГА” („MIASTO BEZ BOGA”) рэж. Яцэк Петрыцкі 2009**
**„POSTE RESTANTE” рэж. Марцэль Лозіньскі 2008**
- атрымаў некалькі ўзнагародаў, сярод якіх:
**Арол, польская кінаўзнагарода за найлепшы мантаж (намінацыя)**
**Узнагарода за мантаж (Патсдам)**
**Узнагарода за мантаж (Кошалін)**